**А. М. МАКАРЭВІЧ,**
доктар філалагічных навук, загадчык кафедры беларускай літаратуры
Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова

# ВЫВУЧЭННЕ ТВОРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ: урокі дадатковага чытання і творчыя работы ў V—VI класах

## Агульны метадычны аспект

На сучасным этапе выкладання і навучання літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі адным з фактараў эфектыўнай арганізацыі працы настаўніка і вучняў з'яўляецца сістэма перспектыўных ліній. Галоўныя мэты навучальнага характару пры гэтым наступныя. Фарміраванне ўменняў успрымання і ацэнкі:

- мастацкага вобраза ў кантэксце адпаведнага твора — *блізкая перспектыва*;
- твора пісьменніка ў межах яго творчай спадчыны — *сярэдняя перспектыва*;
- мастацкага твора, спадчыны пісьменніка і нацыянальнай літаратуры ва ўзаемасувязі літаратурных праяў — *далёкая перспектыва.*

У сувязі з гэтым павінна адбывацца паэтапнае фарміраванне ўменняў і назапашванне ведаў для здзяйснення вучнямі адпаведных відаў дзейнасці пры падрыхтоўцы іх да выканання розных форм працы. Прычым гэтыя формы працы, алгарытмы іх выканання мэтазгодна паступова ўскладняць.

Вельмі важна, каб вучні выразна ўсведамлялі, на якім этапе іх навучання, у якіх відах, формах дзейнасці спатрэбіцца тое, чым яны займаюцца пры падрыхтоўцы да таго ці іншага ўрока, пры выкананні заданняў на адпаведных уроках.

Усведамленне школьнікамі блізкіх, сярэдніх і далёкіх перспектыў іх вучэбнай дзейнасці дазваляе больш рацыянальна, эфектыўна наладжваць тыя ці іншыя формы працы, не паўтараючы некаторыя этапы, вызваляючы пры гэтым час і (галоўнае) адпаведны запас энергіі — разумовай, фізічнай — на здзяйсненне планаў творчага характару. Рацыянальна арганізаваная інтэлектуальная дзейнасць спрыяе назапашванню не толькі фактычнай інфармацыі пэўнага кшталту, паступоваму фарміраванню ўменняў і навыкаў адпаведнай скіраванасці, але і ўзнікненню ў суб'екта такой дзейнасці ўпэўненасці ў сваіх сілах, жадання творча прымяняць назапашаныя веды і навыкі.

Паколькі ў сістэме літаратурнай адукацыі пяты клас з'яўляецца пераходным этапам ад пачатковага навучання (літаратурнае чытанне) да сярэдняга (літаратурнае навучанне), то вельмі важна з самага пачатку яго здзяйснення вучыць пяцікласнікаў рацыянальнай арганізацыі працы з выхадам на развіццё іх творчых здольнасцей. Важна пры гэтым пастаянна арыентаваць школьнікаў на тое, калі, у якіх формах, відах дзейнасці спатрэбяцца ім вынікі іх працы не толькі ў пятым (шостым) класе, але і ў далейшым: пры ўспрыманні імі літаратурных твораў, матэрыял якіх можа быць трывалым падмуркам у працэсе падрыхтоўкі да выканання творчых работ. Такі падыход павінен быць сістэмным. Арыентацыя настаўніка на сістэмны падыход пры вывучэнні твораў для абавязковага чытання, твораў для дадатковага чытання ў праекцыі гэтага матэрыялу на творчыя работы школьнікаў, пачынаючы з пятага класа, дазваляе ствараць трывалы падмурак працэсу рацыянальнай арганізацыі працы як настаўніка, так і вучняў. У сувязі з гэтым звернемся да характарыстыкі наступных аспектаў з улікам сістэмы перспектыўных ліній:



2 «Беларуская мова і літаратура», № 7, 2013 г.

а) выбар форм навучальнай і творчай дзейнасці вучняў, выбар твораў для дадатковага чытання; б) асаблівасці арганізацыі і правядзення ўрокаў па вывучэнні твораў для дадатковага чытання і ўрокаў, на якіх выконваюцца творчыя работы: канкрэтныя мэты, змест, віды дзейнасці настаўніка і вучняў.

## Метадычна-практычны аспект

«Вучэбная праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Беларуская літаратура. V—XI класы» вызначае колькасць гадзін на творчыя работы і акрэслівае «прыкладны спіс твораў для дадатковага чытання» [2, с. 22—23, 34—35], асноўны ж змест гэтых урокаў не акрэсліваецца.

У дапаможніку для настаўнікаў па прыкладным каляндарна-тэматычным планаванні «Беларуская мова і літаратура. 5—6 кл...» даюцца рэкамендацыйныя парады адносна творчых работ вучняў. Што тычыцца вызначэння твораў для ўрокаў па творах для дадатковага чытання, то яно ўвогуле адсутнічае, паколькі «Вучэбная праграма...» такое вызначэнне адсылае настаўніку: «на выбар». Пры гэтым варта звярнуць увагу на тое, што ў планаванні для пятага класа прапаноўваецца спачатку праводзіць урокі, на якіх выконваюцца творчыя работы вучняў, а потым урокі па творах для дадатковага чытання. Апрача гэтага, у адносінах да ўрокаў па творах для дадатковага чытання ў планаванні назіраецца некаторая супярэчнасць: іх паслядоўнасць, далучэнне да адпаведнага зместу «Вучэбнай праграмы...» можна характарызаваць як механічныя (адносна раўнамернае размеркаванне па чвэрцях — пяты клас), у некаторай ступені бессістэмныя (шосты клас), бо не ўлічваецца пры гэтым тэматычны, праблемны, тэарэтычны кантэкст твораў з адпаведных раздзелаў вучэбнага дапаможніка. Варта было б пры гэтым вызначыць у планаванні пералік твораў для кожнага з чатырох урокаў па творах для дадатковага чытання з улікам тэматыкі, праблематыкі, вобразаў гэтых твораў, а таксама твораў з адпаведных раздзелаў вучэбнага дапаможніка.

Рэкамендацыйны характар гэтых частак як «Вучэбнай праграмы...», так і планавання, з аднаго боку, спрыяе творчаму падыходу настаўніка да арганізацыі адпаведных урокаў, з другога, садзейнічае парушэнню сістэмнасці пры іх планаванні і правядзенні, бо настаўнік у такіх умовах «творчай самастойнасці» аказваецца дастаткова часта непадрыхтаваным да паспяховай працы. Болей за тое, як паказвае практыка, настаўнікі дастаткова часта фармальна арганізуюць працу па падрыхтоўцы вучняў да творчых работ і ўрокаў па вывучэнні твораў для дадатковага чытання.

У сувязі з акрэсленым вышэй прапануем адзін з магчымых варыянтаў перспектыўнага планавання і падрыхтоўкі ўрокаў па вывучэнні твораў для дадатковага чытання, а таксама ўрокаў, на якіх выконваюцца творчыя работы. Пры гэтым заўважым, што зыходнай метадычнай тэзай тут з'яўляецца наступная. Такія ўрокі павінны, апрача іншага, выхоўваць у школьнікаў творчы падыход да выказвання сваіх думак, поглядаў, доказаў, вывадаў. Вучэбны працэс і яго вынікі на гэтым этапе павінны спрыяць фарміраванню ў вучняў псіхалагічнай устаноўкі на творчы падыход да маўлення, да самастойнага ўспрымання літаратурнага тэксту і яго ацэнкі. Ад таго, наколькі паспяхова будзе дасягнута гэтая задача, залежыць тое, ці захочуць вучні ў далейшым творча падыходзіць да такіх відаў дзейнасці. Тут важна фарміраваць пазітыўныя іх адносіны да творчай дзейнасці, не перакрэсліць (ні кепскай адзнакай, ні неабачлівай ацэнкай, ні выбарам неадпаведных узроўню падрыхтаванасці вучняў форм працы) іх жаданне самавыявіцца.

Паколькі і ўрокі па творах для дадатковага чытання, і ўрокі, на якіх выконваюцца творчыя работы, маюць на мэце фарміраванне творчых здольнасцей школьнікаў, то іх мэтазгодна праводзіць у пятым-шостым класах чатырма «парамі» (1 + 1 гадзіна): урок па творах для дадатковага чытання і адразу пасля яго ўрок, на якім выконваецца творчая работа. Такая паслядоўнасць гэтых урокаў у падабенстве зместу форм дзейнасці вучняў на іх утварае своеасаблівы *блок творчых урокаў*. «Пары» гэтых блокаў паводле форм працы, іх зместу, тэматычнай скіраванасці твораў вучэбнага дапаможніка павінны быць цесна злучаны з раздзеламі, у кантэксце якіх яны праводзяцца. Адпаведныя формы дзейнасці вучняў у межах гэтых блокаў, па-першае, спрыяюць падрыхтоўцы школьнікаў да больш эфектыўнай іх дзейнасці пры выкананні заданняў па творчых работах, па-другое, садзейнічаюць назапашванню падагульненняў, ілюстрацый да папярэдне

вывучанага матэрыялу тых раздзелаў, пасля якіх праводзяцца «пары» (урок па вывучэнні твораў для дадатковага чытання + урок, на якім вучнямі выконваецца творчая работа).

## Пяты клас

Перспектыўнае планаванне ўрокаў па вывучэнні твораў для дадатковага чытання і ўрокаў, на якіх вучнямі выконваецца творчая работа, мэтазгодна здзяйсняць у наступнай паслядоўнасці.

1. Выбар літаратурных твораў з «Вучэбнай праграмы...» для ўрокаў па творах для дадатковага чытання. Тут важна, каб яны тэматычна пераклікаліся з творамі, якія вывучаюцца ў кантэксце адпаведных раздзелаў. Для ўрокаў па творах для дадатковага чытання ў пятым класе прапануем наступныя тэксты: «Як сінячок да сонца лётаў» У. Дубоўкі, «Цюцік» Я. Брыля, «Скрыпач і ваўкі» К. Каганца, «Чортаў скарб» У. Караткевіча.

2. Выбар тэм для творчых работ з улікам «Асноўных відаў работ па літаратуры...». Пры гэтым можна прыняць парады з прыкладнага планавання: а) вуснае выказванне на тэму «Мой родны кут, як ты мне мілы!», б) падагульняльны ўрок-конкурс (расказванне вучнем складзенай ім казкі), в) вусная замалёўка на падставе ўласных назіранняў за прыроднымі з'явамі, д) разгорнуты адказ на пытанне з элементамі характарыстыкі літаратурнага героя па адным з вывучаных твораў [5, с. 71, 76, 83, 91]. Такая тэматыка творчых работ не супярэчыць «Асноўным патрабаванням да ведаў, уменняў і літаратурнага развіцця вучняў V класа»: «<...> рыхтаваць вусныя сачыненні з элементамі апісання і разважання <...>» [2, с. 25]. Урокі па прапанаваных вышэй тэмах у далейшым пры каляндарным планаванні можна гарманічна аб'яднаць з урокамі па вывучэнні твораў для дадатковага чытання дзеля ўтварэння «пар» урокаў у адпаведнасці з тэматыкай і зместам раздзелаў вучэбнага дапаможніка.

3. Вызначэнне *блока творчых урокаў.* У сувязі з акрэсленым вышэй прапануем адзін з яго варыянтаў з улікам мэт, задач і зместу ўрокаў, вызначаных «Вучэбнай праграмай...» і планаваннем (гл. табліцу).

4. Структураванне алгарытмаў працы настаўніка і вучняў на перспектыву: час і форма аб'яўлення заданняў на перспектыву, формы падрыхтоўкі да ўрокаў па творах для дадатковага чытання і ўрокаў, на якіх выконваецца творчая работа, перспектывы канкрэтных форм працы на ўроках па тэмах, вызначаных «Вучэбнай праграмай...», пры выкананні дамашніх заданняў у кантэксце творчага выхаду на ўрокі па творах для дадатковага чытання і ўрокі, на якіх выконваецца творчая работа.

**Навучальная сувязь урокаў па тэмах, вызначаных «Вучэбнай праграмай...», з урокамі па творах для дадатковага чытання і ўрокамі, на якіх выконваецца творчая работа***

| Першы блок (пасля раздзела «Мой чароўны беларускі край...») 6—7 урокі | |
|---|---|
| **Урок па вывучэнні твораў, вызначаных «Вучэбнай праграмай...»** | ***УДЧ:* У. Дубоўка. «Як сінячок да сонца лётаў».** ***УТР: Вуснае выказванне на тэму «Мой родны кут, як ты мне мілы!»***** |
| 1 | 2 |
| *Урок 2.* **П. Броўка. «Калі ласка»**: вучыць выяўляць пачуцці і думкі, адлюстраваныя ў паэтычным тэксце: гонар за высокія маральныя якасці; характарызаваць меладычнасць, трапнасць і выразнасць роднай мовы. | *УДЧ*: вучыць самастойна вызначаць у гэтым творы вобразнае адлюстраванне пачуццяў і памкненняў птушак: спагадлівасць, добразычлівасць, нядобразычлівасць, справядлівасць, удзячнасць. *УТР*: фарміраваць уменні вобразнага і трапнага выказвання. |

* Умоўныя скарачэнні: УДЧ — урок па творах для дадатковага чытання, УТР — урок, на якім выконваецца творчая работа.

** Магчымы варыянт гэтай тэмы ў адпаведнасці з планаваннем — «Прырода майго краю: яна выклікае ў мяне захапленне!». Агульная мэта гэтага УТР, паводле названай вышэй крыніцы, падагульніць і сістэматызаваць веды і ўменні, набытыя пяцікласнікамі пры вывучэнні раздзела «Мой чароўны беларускі край...».

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 |
|---|---|
| *Урок 4.* **У. Караткевіч. «Бацькаўшчына»**: развіваць вобразнае ўяўленне пры ўспрыманні мастацкага апісання прыроды; вучыць выяўляць вобразы і сродкі адлюстравання аўтарскіх пачуццяў, перажыванняў; развіваць вобразнае ўяўленне вучняў пры ўспрыманні мастацкага апісання прыроды; удасканальваць уменні ўзнаўляць карціны і вобразы, створаныя пісьменнікам. | *УДЧ*: вучыць вылучэнню паказальных знешніх прыкмет птушак на падставе вобразных сродкаў, мастацкага тэксту (зварот да гэтых элементаў твора садзейнічае выпрацоўцы ўмення фармуляваць выказванне з элементамі апісання).<br>*УТР*: фарміраваць уменні выкарыстання ў вусным выказванні прыкладаў з мастацкіх твораў, у якіх заключаецца іх галоўная думка, выказвання вучнямі ўласных пачуццяў, якія з'явіліся пры ўспрыманні карцін прыроды ў рэальным жыцці; фармулёўкі галоўнай думкі выказвання; выкарыстання ў вусным выказванні-развважанні прыкладаў з твора, які раней характарызаваўся (развважанне пра самаахвярнасць сінячка, удзячнасць птушак). |
| *Урок 5.* **А. Грачанікаў. «Дрымотна ціснуцца кусты...»; Я. Крупенька. «Ёсць у кожнага з нас...»**: фарміраванне ўяўлення пра мастацкі вобраз. | *УТР*: вучыць захаванню ў пераказе эпізодаў твора адпаведных вобразных сродкаў (вобразы сінячка, пугача могуць быць выкарыстаны ў якасці прыкладаў у вусных выказваннях вучняў); фарміраваць уменні вуснага выказвання з элементамі апісання і развважання. |
| **Другі блок (пасля раздзела «За смугою стагоддзяў»)<br>19—20 урокі** | |
| **Урок па вывучэнні твораў, вызначаных «Вучэбнай праграмай...»** | ***УДЧ:* У. Караткевіч. «Чортаў скарб».**<br>***УТР:* Падагульняльны ўрок-конкурс па раздзеле вучэбнага дапаможніка**** |
| *Урок 7.* **Беларускія народныя казкі, іх віды і жанравыя адметнасці**: пазнаёміць з відамі народных казак, у прыватнасці, з чарадзейнымі; вучыць разумець асноўны канфлікт казкі, выдзяляць эпізоды, важныя для характарыстыкі казачных герояў. | *УДЧ*: вучыць вызначаць від казкі, будаваць магчымы яе працяг у выглядзе асобных чарадзейных эпізодаў, вызначаць асаблівасці вырашэння канфлікту ў казцы, вылучаць адпаведныя эпізоды-характарыстыкі ў «Чортавым скарбе».<br>*УТР*: фарміраваць уменні пабудовы канфлікту ва ўласна складзенай казцы і на яго аснове ўменні развіцця дзеяння ў невялікіх казачных эпізодах, непасрэдных характарыстык дзейных асоб у складзенай вучнямі казцы. |
| *Урок 8.* **Чарадзейная казка «Залаты птах»**: вучыць вылучаць у літаратурнай казцы эпізоды, важныя для характарыстыкі казачных герояў, аналізу паводзін казачных персанажаў паводле выяўлення маральных каштоўнасцей, аналізаваць адметнасці будовы казкі, выяўляць элементы чарадзейнага ў ёй. | *УДЧ*: вучыць вызначаць рысы характару казачных персанажаў у «Чортавым скарбе», аналізаваць будову гэтай казкі і выяўляць элементы чарадзейнага ў ёй.<br>*УТР*: вучыць вызначаць маральныя якасці казачных персанажаў, пра якіх вучні будуць апавядаць у складзенай імі казцы. |
| *Урок 10.* **Казкі пра жывёл «Музыкі» і «Воўк і сабака»**: падагульніць веды вучняў пра жанравыя адметнасці казак. | *УДЧ*: вучыць вызначаць жанравыя адметнасці казкі «Чортаў скарб».<br>*УТР*: фарміраваць уменні складаць казачныя эпізоды, казкі паводле задуманага сюжэту, выбраных казачных персанажаў і іх маральных якасцей. |

* Форма ўдзелу ў конкурсе — расказванне складзенай вучнем казкі.

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 |
|---|---|
| **Трэці блок (пасля раздзела «Казка — у жыцці падказка») 40—41 урокі** | |
| **Урок па вывучэнні твораў, вызначаных «Вучэбнай праграмай...»** | ***УДЧ:*** **К. Каганец. «Скрыпач і ваўкі».**<br>***УТР:*** **Вусная замалёўка на падставе ўласных назіранняў за прыроднымі з'явамі** |
| *Урок 22.* **Якуб Колас. «Крыніца»**: удасканальваць уменні вучняў па раскрыцці аўтарскага погляду на падзеі жыцця і на саміх герояў, іх паводзіны, перакананні.<br><br>*Урок 25.* **У. Караткевіч. «Нямоглы бацька»**: спрыяць спасціжэнню вучнямі аўтарскай пазіцыі. | *УДЧ*: вучыць выяўляць аўтарскі погляд на падзеі твора (фінал казкі К. Каганца «Скрыпач і ваўкі»).<br>*УТР*: фарміраваць уменні выказваць уласны погляд, уражанні адносна з'яў прыроды на падставе асабістых назіранняў. |
| *Урок 23.* **Якуб Колас. «Крыніца»**: развіваць уменне дзяліць твор на сэнсавыя часткі, складаць план. | *УДЧ*: развіваць уменне пераказваць мастацкі тэкст на падставе складзенага плана.<br>*УТР*: фарміраваць уменні перадаваць уласныя назіранні ў адпаведнасці з заданнямі і планам замалёўкі. |
| *Урок 29.* **А. Федарэнка. «Падслуханая казка»**: фарміраваць уменні вызначэння мастацкіх апісанняў прыроды, часу і месца дзеяння. | *УДЧ*: вучыць вызначаць час, месца дзеяння, характарызаваць паслядоўнасць дзеяння.<br>*УТР*: вучыць назіраць за прыроднымі з'явамі, заўважаць у прыродзе адметныя яе праявы (дэталі). |
| *Урок 31.* **М. Вагдановіч. «Зімой»**: развіваць вобразнае ўяўленне вучняў, здольнасць «бачыць» карціны прыроды. | *УДЧ*: вучыць характарызаваць прыродную прастору, у якой развіваецца дзеянне твора.<br>*УТР*: вучыць малявацъ словамі цэласную карціну пэўнай прыроднай прасторы. |
| *Урок 33.* **Якуб Колас. «Песня ляснога жаваранка»**: вучыць бачыць сувязь апісанняў прыроды з настроем і характарам чалавека, спрыяць спасціжэнню ролі эпітэтаў у мастацкім тэксце. | *УДЧ*: фарміраваць уменні выяўлення ў казцы адчуванняў яе герояў і характарыстыкі іх пры дапамозе вобразных сродкаў.<br>*УТР*: вучыць заўважаць у прыродзе падрабязнасці і дэталі, вобразна характарызаваць іх пры дапамозе эпітэтаў. |
| **Чацвёрты блок (пасля раздзела «Сцежкамі дзяцінства») 64—65 урокі** | |
| **Урок па вывучэнні твораў, вызначаных «Вучэбнай праграмай...»** | ***УДЧ:*** **Я. Брыль. «Цюцік».**<br>***УТР:*** **Разгорнуты адказ на пытанне з элементамі характарыстыкі літаратурнага героя па адным з вывучаных твораў*** |
| *Урок 45.* **Якуб Колас. «У старых дубах»**: удасканальваць уменні характарызаваць героя па яго ўчынках, паводзінах, думках, перажываннях, параўноўваць характары і паводзіны герсяў у межах аднаго твора, рабіць высновы, абгрунтоўваць свае ацэнкі. | *УДЧ*: вучыць вызначаць ключавыя эпізоды, у якіх раскрываюцца адносіны герояў апавядання да сабачкі з улікам паводзін апошняга.<br>*УТР*: фарміраваць уменні рабіць падагульненні пра літаратурнага героя, вызначаць асаблівасці, формы яго характарыстык у мастацкім творы. |

* Пытанні для *УТР* пералічаны ў прыкладным планаванні; выбіраем адно з іх дзеля ілюстрацыі: *«Дружба Сяргея з Бурыкам» (У. Караткевіч. «Былі ў мяне мядзведзі»).*

*Заканчэнне табліцы*

| 1 | 2 |
|---|---|
| *Урок 51.* **А. Кудравец. «Цітаўкі»**: вучыць вызначаць ключавыя эпізоды, важныя для характарыстыкі герояў, асэнсоўваць этапы развіцця дзеяння, акрэсліваць ланцужок падзей.<br>*Урок 56.* **Г. Далідовіч «Страта»**: вучыць вылучаць эпізоды, важныя для характарыстыкі персанажаў. | *УДЧ*: вучыць характарызаваць адносіны розных літаратурных герояў «Цюціка» да сабачкі.<br>*УТР*: фарміраваць уменні вылучаць галоўнае ў паводзінах літаратурнага героя. |
| *Урок 52.* **А. Кудравец. «Цітаўкі»**: вучыць падсумоўваць назіранні за паводзінамі герояў, звяртаючы ўвагу на раскрыццё душэўнага стану персанажаў. | *УДЧ*: вучыць характарызаваць душэўны стан літаратурных герояў (дзяцей) у сувязі з адносінамі дарослых да сабачкі.<br>*УТР*: фарміраваць уменні даваць ацэнкі літаратурнаму герою ў адпаведнасці з яго ўчынкамі і перажываннямі. |
| *Урок 62.* **М. Лужанін. «Добры хлопец Дзік»**: вучыць характарызаваць стасункі паміж чалавекам і жывёлінай, каменціраваць паводзіны апошняй у розных сітуацыях.<br>*Урок 59.* **У. Караткевіч. «Былі ў мяне мядзведзі»**: вучыць засяроджваць увагу на ўзаемаадносінах чалавека і жывёліны. | *УДЧ*: вучыць характарызаваць стасункі паміж літаратурнымі героямі ў кантэксце іх адносін да сабачкі.<br>*УТР*: фарміраваць уменні падрыхтоўкі разгорнутага адказу ў сувязі з адпаведным заданнем (вызначыць і ахарактарызаваць асаблівасці сяброўства літаратурнага героя з жывёлінай). |
| *Урок 60.* **У. Караткевіч. «Былі ў мяне мядзведзі»**: фарміраваць уменні вызначэння ідэі твора на падставе значэння вобраза Бурыка і гісторыі яго сяброўства з Сяргеем. | *УДЧ*: вучыць асэнсоўваць выхаваўчае значэнне твора на падставе засваення яго ідэі.<br>*УТР*: фарміраваць уменні рабіць агульны вывад у адносінах да зробленай характарыстыкі Сяргея і Бурыка. |

Каляндарнае планаванне ўрокаў па творах для дадатковага чытання і ўрокаў, на якіх вучнямі выконваецца творчая работа, у сувязі з прыведзенымі вышэй прапановамі можа здзяйсняцца ўжо ў адпаведнасці з узроўнем падрыхтаванасці вучняў, творчымі іх здольнасцямі і інш.

Магчымымі формамі падрыхтоўчай і непасрэднай працы на ўроках па творах для дадатковага чытання могуць быць тыя, якія прапанаваны В. Я. Ляшук [3], М. І. Верціхоўскай (напрыклад, падрыхтоўка і правядзенне ўрока па творы А. Федарэнкі «Шчарбаты талер» [1, с. 127—167]).

Этапы ж падрыхтоўкі да ўрокаў, на якіх выконваецца творчая работа, могуць быць наступныя: а) аб'яўленне тэм і прыкладных планаў творчай работы ў самым пачатку працы з адпаведным раздзелам вучэбнага дапаможніка (форма — друкаваная: на стэндзе ў кабінеце беларускай мовы і літаратуры, у выглядзе індывідуальных заданняў для вучняў з розным узроўнем падрыхтаванасці); б) назапашванне фактаў, фарміраванне адпаведных уменняў (на перспектыву — урокі па творах для дадатковага чытання і ўрокі, на якіх выконваецца творчая работа) пры вывучэнні твораў, вызначаных «Вучэбнай праграмай...» для адпаведных раздзелаў; на кожным уроку мэтазгодна здзяйсняць кароткі (прыблізна ў 5 хвілін) зварот да перспектыў выкарыстання назапашаных ведаў і ўменняў на адпаведных уроках па творах для дадатковага чытання і ўроках, на якіх выконваецца творчая работа; пры гэтым неабходна рабіць апорныя запісы ў літаратурных сшытках; в) невялікія творчыя дамашнія заданні, якія маюць на мэце перспектыўную падрыхтоўку да ўрокаў, на якіх будзе выконвацца творчая работа па адпаведных тэмах.

## Шосты клас

### Формы і змест падрыхтоўчай (у працэсе ўспрымання) і непасрэднай працы з творамі для дадатковага чытання

**Чытанне твораў вучнямі.** У працэсе планавання дзейнасці вучняў настаўнік павінен вызначыць такі час (перыяд), калі шасцікласнікі змогуць звярнуцца да ўспрымання адпаведнага мастацкага твора з тым разлікам, каб да ўрока па творы для дадатковага чытання адпаведны тэкст быў не толькі імі прачытаны, а і асэнсаваны ў кантэксце папярэдніх заданняў да яго. У дадзеным выпадку арыентуемся на цэласнае ўспрыманне мастацкага твора. У сувязі з гэтым мэтазгодна задаваць чытанне буйных формаў на лета. Аднак, як паказвае практыка, далёка не ўсе вучні выконваюць такое заданне. Таму за некалькі тыдняў да першага ўрока па творы варта сарыентаваць шасцікласнікаў на чытанне адпаведнага мастацкага твора. У тых выпадках, калі ў школьнай бібліятэцы няма ў дастатковай колькасці названых вышэй тэкстаў для дадатковага чытання (альбо яны зусім адсутнічаюць), варта іх, невялікія аб'ёмам, альбо адсканіраваць, альбо зрабіць ксеракопіі і прапанаваць іх вучням. Акрамя таго, творы для дадатковага чытання можна знайсці на адпаведных інтэрнэт-старонках [6].

**Парады да выканання заданняў па творы.** **А.** Пазнаёміцца з заданнямі і пытаннямі. **Б.** Прачытаць твор. **В.** Перачытваючы адпаведныя часткі тэксту, выканаць заданні да іх*.

**Заданні для вучняў у працэсе чытання твора.** Яны агучваюцца, каменціруюцца і прапаноўваюцца вучням у раздрукаваным варыянце ў той час, калі настаўнік упершыню арыентуе вучняў на чытанне твора. У заданнях і пытаннях мэтазгодна прыводзіць цытаты з адпаведнага твора. Гэта дапаможа школьнікам адшукаць у тэксце неабходныя для характарыстыкі часткі, сарыентуе на выкарыстанне цытат ва ўласных выказваннях, паспрыяе фарміраванню ўменняў выкарыстання цытат у пісьмовай форме выказвання (такую форму падрыхтоўчай працы мэтазгодна здзяйсняць у адносінах да заданняў па кожным творы для дадатковага чытання).

**Першы блок: а)** урок № 7 — урок па творы для дадатковага чытання — п'еса-казка Людмілы Рублеўскай «Янук, Рыцар Мятлушкі»; **б)** урокі №№ 8—14 — раздзел «Свет загадак і цудаў» з вучэбнага дапаможніка; **в)** урокі №№ 7—14, № 15 — паралельная падрыхтоўка «вуснай замалёўкі пра міфалагічнага бога альбо духа» [5, с. 101]; **г)** урок № 15 — творчая работа — непасрэдная падрыхтоўка вуснай замалёўкі.

**Першы ўрок па творы для дадатковага чытання** — характарыстыка п'есы-казкі Л. Рублеўскай «Янук, рыцар Мятлушкі».

1. Падставы, на аснове якіх гэты твор выбраны для дадзенага ўрока, наступныя. *Па-першае*, ён можа стаць цікавым, займальным, доказным уступам да раздзела вучэбнага дапаможніка «Свет загадак і цудаў»; *па-другое*, пры яго характарыстыцы на ўроку па творы для дадатковага чытання можна будзе праілюстраваць асаблівасці выкарыстання міфалагічных матываў у мастацкай літаратуры; *па-трэцяе*, гэтая п'еса-казка паслужыць у далейшым наглядным і перакананьным прыкладам для вучняў у працэсе іх падрыхтоўкі да творчай работы і выканання задання па ёй.

2. Заданні для вучняў у праекцыі на чытанне п'есы-казкі.

А. Вызначыць паходжанне Мятлушкі, Лесавічка, Жытнічка, Янука: чые яны дзеці, дзе знаходзіцца іх дом (дзея першая).

Б. Выявіць эпізоды, у якіх праяўляюцца рысы характару Янука і Мятлушкі, вызначыць іх (з гэтай мэтай варта ўважліва прачытаць выказванні Янука, асэнсаваць яго ўчынкі, суаднесці іх з ацэнкай Мятлушкі).

В. Прасачыць, у якіх абставінах і як змяняюцца рысы характару Янука (дзеі другая і трэцяя).

Г. Падрыхтаваць характарыстыку знешнасці герояў п'есы; вызначыць, што тут рэальнае, а што казачнае.

Д. Выявіць рэальныя і казачныя прадметы, аб'екты ў творы.

Е. Вызначыць сэнс выказвання Лесавічка ў фінале другой дзеі: «Бываюць імгненні, калі ў кожнага вырастаюць крылы» [4, с. 582].

Ё. Вызначыць сэнс рашэння Мятлушкі ў фінале твора: «Я пасвячаю цябе ў рыцары» [4, с. 586] (з гэтай мэтай варта спачатку прыгадаць, хто такія рыцары, за што яны змагаюцца, што абараняюць, якія ў іх ідэалы).

* Заданні, якія прапаноўваюцца ніжэй, могуць быць іншымі альбо іх колькасць меншая; яны могуць прапаноўвацца індывідуальна вучням у залежнасці ад узроўню іх падрыхтаванасці да ўспрымання падобных тэкстаў; парады да выканання заданняў даюцца па кожным творы для дадатковага чытання.

Ж. Адказаць на пытанні: чаму падабаліся Даратэі нежывыя кветкі з шоўку, чаму Янук не адгукнуўся на прапанову Даратэі быць яе рыцарам.

З. Растлумачыць сэнс фінальнага выказвання Мятлушкі пра тое, што яна і Янук будуць самымі багатымі ў свеце (з гэтай мэтай варта параўнаць папярэднюю рэпліку Янука і адказ на яе Мятлушкі).

3. У працэсе ўрока па творы для дадатковага чытання мэтазгодна ахарактарызаваць п'есу-казку ў адпаведнасці з прапанаванымі вышэй заданнямі.

4. Апрача гэтага, варта на ўроку прачытаць па ролях некаторыя з тых урыўкаў п'есы-казкі, у якіх казачнае пераплятаецца з міфічнымі матывамі. Напрыклад: «Янук. Ах вы, подлыя нападнікі! <...> Мятлушка. Ну, што ты маніш? Вось дзіўныя вы, людзі! Хочаце здавацца не такімі, якія вы ёсць» [4, с. 576—577]. «Янук. Я хачу вызваліць князёўну Даратэю! <...> Янук. Не бойся, Мятлушка, я з табою!» [4, с. 580—581]. У такім выпадку на вобразным, структурным і эмацыянальным узроўнях можна сарыентаваць шасцікласнікаў на форму (выкарыстанне драматургічных элементаў) і змест (яго вобразнасць) творчай працы, да якой яны звернуцца ў далейшым, — вусная замалёўка «Мой свет загадак і цудаў».

5. Перспектыўная сувязь з урокам, на якім будзе здзяйсняцца непасрэдная падрыхтоўка да выканання творчай работы. Форма — паведамленне настаўніка: а) характарыстыка сутнасці творчай работы па выніках вывучэння наступнага раздзела вучэбнага дапаможніка; б) вызначэнне і характарыстыка падрыхтоўчых этапаў і форм працы над ёй; в) раскрыццё асаблівасцей выкарыстання сучасным аўтарам — Л. Рублеўскай — скарбаў беларускай міфалогіі; г) вызначэнне кампазіцыйных асаблівасцей твора з праекцыяй іх на падрыхтоўку шасцікласнікамі творчай работы.

## Спіс літаратуры

1. *Верціхоўская, М.* Урокі літаратуры: пошук і творчасць : дапам. для настаўнікаў / М. Верціхоўская. — Мінск : Лит. и Искусство, 2008. — 224 с.

2. Вучэбная праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Беларуская літаратура. V—XI класы / зацв. Мін-вам адук. Рэсп. Беларусь. — Мінск : Нац. ін-т адук., 2012. — 127 с.

3. *Ляшук, В. Я.* Урокі пазакласнага чытання, IV—VII кл. / В. Я. Ляшук. — Мінск : Нар. асвета, 1984. — С. 5—22.

4. *Рублеўская, Л.* Янук, рыцар Мятлушкі / Л. Рублеўская // Сучасная беларуская драматургія: традыцыі і наватарства / уклад., прадм. П. Васючэнкі. — Мінск : Сэр-Віт, 2003. — С. 575—587.

5. *Язерская, С. А.* Беларуская мова і літаратура. 5—6 кл.: прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі / С. А. Язерская, Л. К. Цітова. — Мінск : НІА — Аверсэв, 2012. — 123 с. — Рэжым доступу: http://knihi.com/anon/Bielaruskaja_mova_i_litaratura_5-6_kl_prykladnaje_kalandarna-tematycnaje_planavannie.html. — Дата доступу: 27.05.2013.

6. Інтэрнэт-рэсурс: knihi.com/skola/6. — Дата доступу: 07.05.2013.

*Заканчэнне будзе.*